**(ознакомительный фрагмент)**

ДЗЯРЖАЎНАЯ НАВУКОВАЯ ЎСТАНОВА
«ЦЭНТР ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ,
МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК
БЕЛАРУСІ»

УДК 398.21 (=161.3)(043.3)

**Атрошчанка Юлія Юр’еўна**

# ПРАЗАІЧНЫЯ ЖАНРЫ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ: ГЕНДАРНЫ АСПЕКТ

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

10.01.09 – фалькларыстыка

Мінск, 2018

Работа выканана ў аддзеле фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў Дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»

**Навуковы кіраўнік:** **Марозаў Аляксандр Уладзіміравіч,** доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры міжкультурных камунікацый Установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**Афіцыйныя апаненты:** **Новак Валянціна Станіславаўна,** доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі Установы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны»

**Лук’янава Таццяна Валер’еўна,** кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры тэорыі літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

**Апаніруючая арганізацыя:** Установа адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна»

Абарона адбудзецца «19» красавіка 2018 г. у 13.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.42.01 пры Дзяржаўнай навуковай установе «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» па адрасе: 220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2, п. 302 (тэл. вучонага сакратара: 284-29-24; E-mail: szdis_D01.42.01@mail.ru).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі».

Аўтарэферат разасланы «__» сакавіка 2018 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый,
кандыдат філалагічных навук Т. Д. Рабец

# УВОДЗІНЫ

Гендарныя адносіны складаюць адзін з галоўных аспектаў сацыяльнага і культурнага жыцця грамадства. Кардынальныя грамадскія пераўтварэнні, якія адбыліся ў апошнія дзесяцігоддзі, прывялі да істотных змен у жыцці беларускага народа, таксама ва ўнутрысямейных і міжполавых адносінах людзей, што не магло не паўплываць і на культуру народа ва ўсіх яе праявах. У кожнай культуры існуюць свае спосабы рэпрэзентацыі гендара, вызначаецца спецыфічны набор гендарных роляў і магчымых жыццёвых сцэнарыяў. Адным з найбольш прадуктыўных спосабаў вывучэння сутнасці паняцця «гендар» як сацыякультурнай з'явы, спецыфікі ўзнікнення і далейшага развіцця гэтага феномена з'яўляецца даследаванне празаічных жанраў беларускага фальклору, якія найбольш поўна захавалі ў сабе гістарычны вопыт народа і адлюстроўваюць складаны працэс грамадскага фарміравання мужчынскіх і жаночых роляў, выяўляюць асаблівасці ў паводзінах і характарыстыках персанажаў фальклорных твораў.

На працягу стагоддзяў у беларусаў фарміравалася сістэма ўяўленняў пра сямейныя каштоўнасці, узаемаадносіны мужчыны і жанчыны, іх сацыяльныя статусы і ролі, што не магло не адлюстравацца ў вуснай народнай творчасці. Беларускія казкі, легенды, паданні ўяўляюць сабой феномен, які, дзякуючы свайму працягламу існаванню і захаванасці, не толькі дазваляе вывучаць традыцыйную культуру, светапогляд і каштоўнасныя арыентацыі народа, але і дае магчымасць прасачыць працэс трансфармацыі мадэлі грамадства ад старажытнасці да нашых часоў. У сувязі з гэтым вывучэнне фальклорных твораў у гендарным аспекце набывае асабліва актуальны і значны характар.

Асобныя пытанні гендарнай дыферэнцыяцыі, якая прысутнічае на розных узроўнях сацыяльнага жыцця, уключаючы структуру сям'і, рэлігійныя сістэмы, мову, міфалагічныя ўяўленні, не раз уздымаліся ў даследаваннях спецыфікі розных жанраў фальклору. Аднак праблема, звязаная з вывучэннем гендарнага аспекту фарміравання і функцыянавання фальклорнай прозы, стылю і вобразнай сістэмы яе асобных жанраў, да сённяшняга дня застаецца не вырашанай. Патрабуюць глыбокага філалагічнага асэнсавання ідэі, што этнакультурныя ўяўленні пра гендарныя адрозненні, прадвызначанае становішча мужчыны і жанчыны ў пэўнай традыцыі, іх сацыяльныя ролі і статусы ўплываюць на фарміраванне фальклорнага мыслення і функцыянаванне жанраў беларускай вуснапаэтычнай творчасці. Гендарны падыход да вывучэння народнай прозы

дазваляе ўдакладніць некаторыя тэарэтычныя палажэнні, у тым ліку сістэматызаваць народныя ўяўленні пра тыпы шлюбных і сямейных адносін, што адбіліся ў матывах і сюжэтах фальклорнай прозы, асэнсаваць гендарны вопыт носьбітаў традыцыі, які выяўляецца праз паэтыку адпаведных жанраў, зразумець аспект легендарнай і казачнай фантастыкі.

Даследаванне праводзіцца ў кантэксце сацыякультурнай скіраванасці беларускай фалькларыстыкі. У сувязі з тым, што ў апошнія дзесяцігоддзі ў грамадстве назіраецца працэс запазычання вобразаў і сімвалаў з іншага культурнага асяроддзя, якія, як правіла, не адпавядаюць гендарнай этнічнай культуры і ва ўмовах глабалізацыі прыніжаюць нацыянальна значныя канцэпты, асабліва тыя, якія тычацца сямейных стасункаў, узнікае вострая неабходнасць звароту да народнай творчасці як важнейшай крыніцы каштоўнасных арыенціраў і традыцый народа.

Навуковая значнасць даследавання вызначаецца метадалагічнымі задачамі развіцця беларускай фалькларыстыкі. Нягледзячы на наяўнасць у айчыннай гуманітарнай навуцы невялікай колькасці работ, прысвечаных вывучэнню традыцыйнай культуры ў гендарным аспекце, у беларускай фалькларыстыцы да цяперашняга часу адсутнічалі комплексныя даследаванні праблемы ўвасаблення гендарных уяўленняў у тэкстах народнай прозы. Для аналізу вуснай народнай творчасці звычайна выкарыстоўваліся філалагічны, мастацтвазнаўчы, культурна-гістарычны і філасофскі падыходы. На сучасным этапе развіцця навукі вельмі важнай становіцца распрацоўка гендарнага аспекту вывучэння беларускага фальклору, які прадугледжвае актуалізацыю замацаванага ў вусна-паэтычнай творчасці калектыўнага сацыякультурнага вопыту беларусаў, нацыянальных сямейных каштоўнасцей, норм і ідэалаў міжполавых адносін.

Улічваючы асаблівую ўвагу беларускай дзяржавы да праблемы гендарнай няроўнасці ў сем'ях і грамадстве ўвогуле, што пацвярджаецца ўвядзеннем Нацыянальнага плана дзеянняў па забеспячэнні гендарнай роўнасці ў Рэспубліцы Беларусь на 2017 – 2020 гады (Пастанова № 149 ад 17.02.2017 г.), даследаванне сістэмы гендарных уяўленняў, увасобленых у празаічных жанрах беларускага фальклору, набывае актуальнасць і практычную значнасць. Матэрыялы дысертацыі пашыраюць веды пра фальклор, гісторыю і сацыяльную культуру беларусаў і робяць унёсак у комплекснае даследаванне беларускай народнай прозы.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі**

Дысертацыйнае даследаванне адпавядае прыярытэтнаму напрамку фундаментальных даследаванняў ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі» і падпраграме №13.1 «Гісторыя і культура» Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2016–2020 гг. «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства», зацверджанай Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 483 ад 10.06.2015 г., і выканана ў межах навуковых тэм «Традыцыі беларускай народнай творчасці ў глабалізаваным славянскім свеце: аксіялогія, сацыядынаміка, жанрававідавая разнастайнасць фальклору» (2006–2010 гг.), «Народная творчасць у сацыякультурных умовах сучаснай Беларусі: рэгіянальная разнастайнасць і міжславянскія сувязі фальклору і постфальклору» (2011–2015 гг.) і «Фальклорная спадчына беларусаў у сучасным славянскім свеце: паралелі, генезіс, лакальныя асаблівасці» (2016–2020 гг.), якія распрацоўваліся аддзелам фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі».

**Мэта і задачы даследавання**

**Мэта** дысертацыйнага даследавання – комплексная характарыстыка сістэмы гендарных уяўленняў, увасобленай у творах казкавай і няказкавай прозы беларускага фальклору.

Дзеля дасягнення адзначанай мэты ставяцца наступныя **задачы**:

1) раскрыць змест і перспектывы гендарнага падыходу ў фалькларыстычных даследаваннях;

2) вызначыць мадэль гендарных стасункаў персанажаў у чарадзейных казках;

3) акрэсліць сістэму гендарных стэрэатыпаў у беларускіх сацыяльна-бытавых казках;

4) раскрыць жанравую спецыфіку анімалістычных казак праз гендарныя ролі і характарыстыкі тыповых жывёльных вобразаў;

5) выявіць адметнасць канструявання гендарнай карціны свету ў легендах, былічках і бывальшчынах;

6) прасачыць змены поглядаў беларусаў на міжполавыя стасункі і сацыяльныя статусы мужчыны і жанчыны ў паданнях і вусных апавяданнях.

**Аб’ектам** даследавання выступаюць празаічныя жанры беларускага фальклору (чарадзейныя, сацыяльна-бытавыя казкі і казкі пра жывёл, легенды, былічкі, бывальшчыны, паданні, вусныя апавяданні).

**Прадметам** даследавання з’яўляецца сістэма гендарных уяўленняў, увасобленая ў празаічных жанрах беларускага фальклору.

**Навуковая навізна** работы заключаецца ў тым, што:

- упершыню ў гісторыі айчыннай фалькларыстыкі вылучаецца для даследавання праблема ўвасаблення гендарных уяўленняў у празаічных жанрах беларускага фальклору;
- раскрываецца спецыфіка гендарнага падыходу да аналізу фальклорных твораў, вызначаецца праблемнае кола і паняційны апарат даследавання, удакладняецца метадалогія гендарных даследаванняў у фалькларыстыцы, якая прадугледжвае выкарыстанне як агульнанавуковых метадаў, так і спецыяльных метадаў дэканструкцыі тэксту і кантэнт-аналізу, што дазваляе ўсебакова ахарактарызаваць сістэму ўзаемаадносін мужчынскіх і жаночых персанажаў, гендарных стэрэатыпаў, ступень трансфармацыі ўяўленняў пра мужчын і жанчын у беларускай народнай прозе;
- на матэрыяле беларускіх чарадзейных казак разглядаецца мадэль гендарных стасункаў пэўных персанажаў, а таксама праблема гендарнай вызначанасці фальклорнага «аўтара», якая не знайшла дастатковай рэалізацыі ў працах фалькларыстаў. Пад паняццем «аўтар» у даследаванні выступае носьбіт канцэпцыі ўсяго твора, асяроддзе фарміравання пэўнага жанру;
- упершыню сацыяльна-бытавыя казкі вывучаюцца ў гендарным аспекце. На фоне сацыяльнага канфлікту селяніна і пана, мужыка і папа вылучаецца сістэма гендарных стэрэатыпаў, актуальная для традыцыйнага грамадства;
- раскрываецца своеасаблівасць жанру анімалістычных казак у кантэксце гендарных уяўленняў, якая заключаецца ў адсутнасці полавай іерархіі персанажаў;
- упершыню ставіцца і вырашаецца пытанне адметнасці гендарнай карціны свету ў легендах, былічках і бывальшчынах;
- высвятляюцца гістарычныя трансфармацыі гендарных уяўленняў грамадства на прыкладзе беларускіх паданняў і вусных апавяданняў.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Гендарны падыход да вывучэння сістэмы вобразаў, паэтыкі, сюжэтаў і матыўнага поля празаічных жанраў беларускага фальклору дазваляе атрымаць дакладнае ўяўленне пра ўзаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць асобных жаночых і мужчынскіх вобразаў як элементаў адзінай сістэмы, прасачыць асаблівасці фарміравання ўяўленняў пра міжполавыя стасункі ў кожным жанры беларускай народнай прозы, вылучыць сувязь мастацкай

карціны свету фальклорных твораў з сістэмай гендарных адносін у грамадстве.

2. Чарадзейная казка арыентуецца на маскулінную і фемінную гендарныя мадэлі ў рознай ступені. Дамінантнымі з'яўляюцца патрыярхатныя гендарныя стэрэатыпы, што тлумачыцца пазіцыяй мужчыны-героя ў мастацкім свеце казкі. Нягледзячы на тое, што ў асноўным тэксты казак увасабляюць сістэму патрыярхатных гендарных установак, у шэрагу твораў заўважаюцца прыкметы матрыярхатнай формы арганізацыі соцыуму – матрылінейнасць і матрылакальнасць, што сведчыць пра захаванне імі пэўнай мастацкай каштоўнасці ў наступныя часы.

3. Беларускія сацыяльна-бытавыя казкі ўвасобілі сістэму патрыярхатных гендарных стэрэатыпаў жаночага і мужчынскага, сямейных стасункаў, якія з'яўляюцца адной з базавых структур нацыянальнай ментальнасці, таму застаюцца актуальнымі і для сучаснай беларускай культуры. Каштоўнасць сям'і з пэўным размеркаваннем жаночых і мужчынскіх абавязкаў з'яўляецца дамінантнай ідэяй твораў, дзе малююцца адхіленні ад гендарнай нормы з боку мужчын і жанчын.

4. Анімалістычныя казкі галоўным чынам захоўваюць матрыцу эгалітарных гендарных установак. У іх няма яўнай іерархіі персанажаў, барацьбы за ўладу, сямейная тэма не распрацавана. У цэнтры сюжэтаў знаходзяцца міжполавыя канфлікты, якія не маюць гендарнай афарбоўкі. Гэта выяўляе спецыфіку жанру казак пра жывёл, дзе ў сістэме персанажаў і іх характарыстык суадносіцца гендарна адзначанае і гендарна нейтральнае.

5. У беларускіх народных легендах, былічак і бывальшчынах вызначальнае месца займаюць сямейныя стасункі і сям'я, асноўнай функцыяй якой з'яўляецца забеспячэнне дабрабыту дзяцей. Адметнасць канструявання гендарнай карціны свету легендарнай і міфалагічнай прозы выяўляецца ў сінхранічным суіснаванні царкоўна-хрысціянскай і дахрысціянскай (міфалагічнай) мадэлі гендарных уяўленняў, што паўплывала на неаднароднасць паказу вобраза жанчыны. Яна выступае прадаўжальніцай роду, ахоўніцай духоўных традыцый і сямейных каштоўнасцей, і адначасова як першапрычына няўдач мужчыны, што звязваецца з грахоўным пачаткам жаночага персанажа і сувязі яе з іншасветам.

6. Сюжэт беларускіх паданняў будуецца вакол гендарнага канфлікту, дзе непахісны аўтарытэт мужчыны-гаспадара сутыкаецца з бунтарскім норавам падуладнай яму жанчыны, у выніку чаго яна звычайна гіне. Паспяховая рэалізацыя сябе ў ролі галоўнай асобы вымушае гераіню дзейнічаць згодна з законамі андрацэнтрычнага грамадства або карыстацца магічнымі ці фізічнымі сіламі. У вусных апавяданнях знаходзяць адбітак гендарныя ўяўленні больш позняга часу, блізкага да сучаснасці, што

паўплывала на гендарную аснову фальклорных твораў. Мужчына, зберагаючы галоўнае месца ў соцыуме, часткова страчвае свой аўтарытэт у сям'і, а жанчына набывае новыя ролі і свабоды.

**Асабісты ўклад саіскальніцы**

Дысертацыйная работа з'яўляецца навуковым даследаваннем, усе палажэнні якога распрацаваны саіскальніцай самастойна, без суаўтарства з іншымі даследчыкамі. Канкрэтны асабісты ўклад аўтара заключаецца ў тым, што ўпершыню выяўлена сістэма гендарных уяўленняў, адлюстраваных у празаічных жанрах беларускага фальклору; акрэслена кола гендарных стэрэатыпаў у творах казкавай і няказквай прозы; праз характарыстыку гендарных роляў тыповых персанажаў вызначаны змены поглядаў беларусаў на міжполавыя стасункі і сацыяльныя статусы жанчыны і мужчыны. Аўтарам працы прааналізаваны і ўведзены ў навуковы зварот новыя тэксты вусных апавяданняў, былічак і бывальшчын, сабраныя саіскальніцай падчас фальклорна-этнаграфічных экспедыцый.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Вынікі дысертацыйнага даследавання былі прадстаўлены ў выглядзе дакладаў на наступных навуковых канферэнцыях: IX Шырмаўскія чытанні (Мінск, 2008); III Міжнародная навукова-творчая канферэнцыя «Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання» (Мінск, 2009); IX Міжнародная навуковая канферэнцыя «Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай» (Мінск, 2009); IV Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання» (Мінск, 2010); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Тэорыя і практыка гендарных даследаванняў у сусветнай навуцы» (Пенза, 2010); Міжнародная навуковая канферэнцыя «Філалогія – XXI» (Караганда, 2010); Міжнародная навуковая канферэнцыя «Навуковая спадчына А. А. Патабні ў кантэксце развіцця еўрапейскай філалагічнай думкі XI–XXI стст. Да 175-годдзя з дня нараджэння А. А. Патабні» (Харкаў, 2010); XII Шырмаўскія чытанні (Мінск, 2012); III Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Традыцыя і сучасны стан культуры і мастацтва» (Мінск, 2013); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Гісторыя і культура на стыку эпох і цывілізацый: гісторыка-культурная спадчына як рэсурс і вынік развіцця грамадства» (Мінск, 2015).

Вынікі дысертацыі выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе кафедры этналогіі і фальклору факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва ДУА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» з першага семестра 2015/2016 навучальнага года пры падрыхтоўцы і правядзенні лекцый, семінарска-практычных заняткаў па дысцыпліне «Вусная народная творчасць: тэорыя фальклору» для студэнтаў I

курса спецыяльнасці «Народная творчасць (Фальклор)». Таксама матэрыялы даследавання ўкаранены ў рабочы працэс ДУ «Гарадскі дом культуры г. Камянец»: вынікі дысертацыі выкарыстоўваюцца пры метадычных распрацоўках цыкла семінараў «Фальклор і гісторыя Камянецкай зямлі».

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Асноўныя палажэнні дысертацыі і вынікі работы змешчаны ў 16 публікацыях, з якіх 6 артыкулаў апублікаваны ў рэцэнзуемых выданнях, 5 работ змешчаны ў зборніках навуковых артыкулаў, 5 – у зборніках матэрыялаў канферэнцый. Аб’ём артыкулаў у выданнях, уключаных у Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, складае 2,52 аўтарскага аркуша. Агульны аб’ём публікацый – 5,24 аўтарскага аркуша.

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса і дадаткаў. Агульны аб’ём работы складае 177 старонак, з іх 133 старонкі займае асноўны тэкст. Бібліяграфічны спіс утрымлівае 190 пунктаў, у тым ліку ўласныя публікацыі аўтара. Дадатак займае 26 старонак і змяшчае фактычны матэрыял (тэксты казкавай і няказкавай прозы, сабраныя падчас фальклорна-этнаграфічных экспедыцый, а таксама матэрыялы архіваў беларускага фальклору), які быў выкарыстаны пры напісанні практычнай часткі даследавання.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

**Першая глава «Тэарэтыка-метадалагічная аснова даследавання празаічных жанраў беларускага фальклору ў гендарным аспекце»** складаецца з двух раздзелаў, у якіх акрэсліваюцца гістарычныя і метадалагічныя перадумовы дысертацыйнай працы, вызначаецца агульная канцэпцыя і метадалогія даследавання.

У **раздзеле 1.1 «Аналітычны агляд літаратуры»** праводзіцца гістарыяграфічны аналіз навуковых прац па праблеме выяўлення спецыфікі адлюстравання гендарных уяўленняў у празаічных жанрах беларускага фальклору.

Да апошняга дзесяцігоддзя ў фалькларыстычных даследаваннях паняцці «гендар», «гендарныя стэрэатыпы», «гендарныя ролі» амаль не сустракаюцца. Нягледзячы на гэта, фалькларысты даўно маюць справу з

ў сям'і аддаецца бацьку, але аўтарытэт мужчыны ў грамадстве з цягам часу змяншаецца.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Гендарныя даследаванні, якія раскрываюць спецыфіку фальклорнага светабачання праз прызму ўяўленняў пра жаночае і мужчынскае ў культуры і грамадстве ў цэлым, з'яўляюцца перспектыўным кірункам сучаснай фалькларыстыкі. Такі падыход дазваляе пазбегнуць аднабаковасці ў поглядах на розныя з'явы жыцця, адлюстраваныя ў фальклоры, вядзе да больш глыбокага спасціжэння мастацкай рэальнасці і стварэння новай тэарэтыка-метадалагічнай канцэпцыі даследавання беларускага фальклору, калі будзе ўлічвацца спецыфічнасць як мужчынскага, так і жаночага погляду на свет і мастацтва. Гендарны аспект даследаванняў фальклорных твораў спрыяе выпрацоўцы новых прынцыпаў класіфікацыі вобразаў, як гендарна адзначаных і гендарна нейтральных, пераасэнсаванню сацыяльных статусаў персанажаў у тэкстах вуснай народнай творчасці. Праз характарыстыку сістэмы гендарных уяўленняў, увасобленых у творах казкавай і няказкавай прозы беларускага фальклору, вылучаецца і раскрываецца спецыфіка гендарнай карціны свету народа [4, 7, 8, 9, 12, 14].

2. Часткай агульначалавечай і нацыянальнай культуры з'яўляюцца беларускія чарадзейныя казкі, якія ўтрымліваюць значны матэрыял для даследавання грамадскіх адносін, стэрэатыпаў, сямейных каштоўнасцей. Яны акумулююць у сабе пэўную інфармацыю пра рэальную гендарную структуру грамадства, якая ў далейшым увасобілася ў поглядах калектыўнага аўтара. Гендарны аналіз казкавай прозы дазваляе «ўбачыць свет» вачыма мужчыны або жанчыны і выявіць асаблівасці дадзенага «бачання» [13].

На падставе вынікаў даследавання гендарнага аспекту стылю чарадзейных казак было адзначана, што жанравы канон чарадзейных казак суадносіцца з гендарнымі ўяўленнямі мужчыны: у творах прадстаўлены яго жаданні, яго бачанне свету, яго ацэнка падзей, у паэтыцы прасочваецца мужчынская манера паказу фактаў. Пад «аўтарствам» разумеецца асяроддзе зараджэння чарадзейнай казкі як фальклорнага жанру [1].

Беларускія чарадзейныя казкі функцыянуюць як тэксты з ярка выяўленай патрыярхатнай устаноўкай, што абумоўлена часам фарміравання дадзенай разнавіднасці казак. Мужчына як герой і жанчына як ахвяра

складаюць гендарную аснову сістэмы вобразаў. Аднак на фоне моцнай патрыярхатнай асновы казачнага канона, трапляюцца элементы матрыярхату: наследаванне па мацярынскай лініі, пражыванне пасля шлюбу на жаночай тэрыторыі [2, 6, 15].

3. З апорай на канцэптуальныя палажэнні гендарнага аналізу праведзена даследаванне ўвасаблення полаглевых уяўленняў у сацыяльна-бытавых казках, якія функцыянуюць як тэксты з ярка выяўленай патрыярхатнай установкай, што абумоўлена часам фарміравання дадзенай разнавіднасці казак. Вылучаецца наступнае кола стэрэатыпаў, якія характарызуюць традыцыйнае грамадства: «Усе жанчыны імкнуцца выйсці замуж»; «Хатняя гаспадарка – справа жанчыны»; «Найважнейшае ў жанчыне – знешні выгляд»; «Жанчыны празмеру гаваркія»; «Побач з мужчынам павінна быць ідэальная жанчына». Спецыфіка прадстаўленых гендарных стэрэатыпаў набліжае сацыяльныя казкі да сучасных твораў [3].

4. Жанравая спецыфіка анімалістычных казак заключаецца ў сумяшчэнні гендарна адзначанага і гендарна нейтральнага ў характарыстыцы тыповых вобразаў. Полаглевая дамінанта ў творах адназначна не прасочваецца, некаторыя персанажы не маюць суаднесенасці з пэўным полам, адсутнічае лінейнасць у перадачы гендарных роляў, абсалютна не распрацавана тэма сямейных стасункаў. Гэта дае падставы сцвярджаць, што тэксты анімалістычных казак захавалі архаічную мадэль грамадства, якая характарызавалася эгалітарнымі міжполавымі адносінамі [10].

5. Беларускія народныя легенды, былічкі і бывальшчыны ўвасабляюць патрыярхатную мадэль гендарных стасункаў: малады хлопец надзяляецца характарыстыкамі, вызначальнымі для добрага гаспадара, жанаты мужчына выконвае функцыі ахоўніка сваёй сям'і, па ўсіх паказчыках ён мае вышэйшы сацыяльны статус. Нягледзячы на тое, што сацыяльныя нормы суадносяцца з патрыярхатным светабачаннем, жанчына не з'яўляецца падуладнай асобай.

У свядомасці носьбітаў традыцыі «рэлігійнае» часта не супрацьпастаўляецца «міфалагічнаму», а суіснуе ў межах аднаго верavання, што паўплывала на гендарныя ўяўленні. Гендарная карціна свету «містычнага» блоку народнай прозы ўтрымлівае дваякае стаўленне да жаночага вобраза. У этыялагічных легендах сцвярджаецца хрысціянская мараль, паводле якой жанчына лічыцца першапрычынай грэхападзення, таму асобай другаснай, «нячыстай». Іншае стаўленне да жанчыны праяўляецца ў тэкстах легендарных апавяданняў, былічак і бывальшчын, дзе захаваліся выразныя рысы архаічнага светаўспрымання. Тут гераіня паказана адносна свабоднай, з правам выбару свайго лёсу, прасочваецца моцная сувязь з іншасветам, містычнымі сіламі, што надае жаночаму персанажу большую ўпэўненасць, магчымасць самарэалізацыі. Гэта гаворыць аб тым, што пры

пераходзе традыцыйнай беларускай культуры ад міфалагічнай да рэлігійнай сістэмы каштоўнасцей афармляецца і ўзмацняецца неадназначны характар жаночых вобразаў[5].

6. Трансфармацыя сацыяльных статусаў мужчыны і жанчыны па-мастацку пераасэнсоўваюцца ў калектыўнай свядомасці і ўвасабляюцца ў фальклорных творах. Праз сістэму вобразаў, мастацкіх дэталяў паданні і вусныя апавяданні перадаюць полаunion ролевыя нормы і стэрэатыпы, тым самым выконваючы рэгулятыўную функцыю. Сістэма міжполавых сацыяльных адносін, прадстаўленых у творах няказкавай прозы, адпавядае традыцыйнаму грамадству з патрыярхатнымі поглядамі на ролі жанчын і мужчын, стасункі якіх вар'іруюцца ў залежнасці ад жанру. У паданнях фіксуецца жорсткае прадпісанне сацыяльных роляў мужчыны і жанчыны. Калі гераіня выступае ў якасці галоўнага персанажа, яна вымушана дзейнічаць па мужчынскіх сцэнарыях, згодна з нормамі патрыярхатнага грамадства. Вусныя апавяданні перадаюць паслабленне традыцыйнага аўтарытэту мужчыны ў сям'і і набыццё жанчынай права выбару [11, 16].

## Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў

Матэрыялы дысертацыі выкарыстоўваюцца супрацоўнікамі кафедры этналогіі і фальклору факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва ДУА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» пры падрыхтоўцы і правядзенні лекцый, семінарска-практычных заняткаў па дысцыпліне «Вусная народная творчасць: тэорыя фальклору», а таксама ў дзейнасці ўстаноў культуры: пры метадычных распрацоўках цыкла семінараў «Фальклор і гісторыя Камянецкай зямлі» ДУ «Гарадскі дом культуры г. Камянец».

Навуковая і практычная значнасць вынікаў даследавання заключаецца ў тым, што яны могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы курсавых, дыпломных і магістарскіх работ, пры напісанні калектыўных манаграфій, у працэсе выкладання спецкурсаў і спецсемінараў па фальклоры, а таксама пры падрыхтоўцы агульнага лекцыйнага курса гісторыі фалькларыстыкі. Асноўныя палажэнні дысертацыі рэкамендуюцца для ўключэння ў матэрыял вучэбна-метадычных даведнікаў па фалькларыстыцы і міфалогіі, культуралогіі, гісторыі беларускай культуры, тэорыі гендара.

Матэрыялы дысертацыі маюць метадалагічнае і тэарэтычнае значэнне не толькі для фалькларыстыкі, але і для этналінгвістыкі, этналогіі, культуралогіі, сацыялогіі. Праца можа быць карыснай у навукова-папулярным плане і выкарыстоўвацца пры падрыхтоўцы матэрыялаў для перыядычнага друку і спецыялізаваных тэле-, радыёпраграм.

Праведзенае даследаванне садзейнічае рэалізацыі Нацыянальнага плана дзеянняў па забеспячэнні гендарнай роўнасці ў Рэспубліцы Беларусь на 2017–2020 гг. Атрыманыя вынікі могуць быць таксама выкарыстаны ў якасці рэкамендацый пры распрацоўцы і правядзенні дзяржаўных праграм па рэалізацыі сямейнай, моладзевай палітыкі ў рэспубліцы.

## СПІС РАБОТ, АПУБЛІКАВАНЫХ АЎТАРАМ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

### Артыкулы ў рэцэнзуемых навуковых выданнях:

1. Атрощенко, Ю. Ю. Авторство восточнославянских волшебных сказок в контексте гендерной психологии / Ю. Ю. Атрощенко // Вісник Харьківського національного університету імені В. Н. Каразіна. Серія: Філологія. – Харьків, 2010. – № 910. – С. 26–31.

2. Атрошчанка, Ю. Ю. Беларускія народныя казкі ў святле гендэрнай праблематыкі / Ю. Ю. Атрошчанка // Весці БДПУ. Серыя 1. Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2010. – №2. – С. 71–74.

3. Атрошчанка, Ю. Ю. Гендарныя стэрэатыпы ў беларускіх народных сацыяльна-бытавых казках / Ю. Ю. Атрошчанка // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі; пад нав. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2010. – Вып. 9. – С. 233–237.

4. Атрошчанка, Ю. Ю. Гендэрныя даследаванні ў філалагічных навуках канца XX – пачатку XXI стагоддзяў / Ю. Ю. Атрошчанка // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. – Гомель, 2011. – № 2 (65) – С. 149–152.

5. Атрошчанка, Ю. Ю. Гендарная мадэль народнага светабачання беларускай няказкавай прозы / Ю. Ю. Атрошчанка // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі; пад нав. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2013. – Вып. 15. – С. 252–257.

6. Атрошчанка, Ю. Ю. Беларускія чарадзейныя казкі ў кантэксце сямейных адносін / Ю. Ю. Атрошчанка // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. / Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі; пад нав. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2015. – Вып. 17. – С. 252–257.

## Артыкулы ў зборніках навуковых прац:

7. Вашкова, Ю. Ю. Канцэпцыя гендэра ў кантэксце развіцця сучаснай фалькларыстыкі / Ю. Ю. Вашкова // Фалькларыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі / пад нав. рэд. В. В. Прыемка, Т. А. Марозавай – Мінск, 2009. – Вып. 6. – С. 70–74.

8. Атрошчанка, Ю. Ю. Сучасная фалькларыстыка: метадалогія гендарных даследаванняў / Ю. Ю. Атрошчанка // Фалькларыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі / пад нав. рэд. Р. М. Кавалёвай, В. В. Прыемка. – Мінск, 2010. – Вып. 7. – С. 238–243.

9. Атрошчанка, Ю. Ю. Гендарная фалькларыстыка: стан і праблемы сучасных даследаванняў / Ю. Ю. Атрошчанка // Вулей і пчолы. Вектары сучаснай фалькларыстычнай школы БДУ : зб. арт. / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; рэдкал.: Р. М. Кавалёвай, В. В. Прыемка. – Мінск, 2011. – С. 197–202.

10. Атрошчанка, Ю. Ю. Казкі пра жывёл: гендэрная аснова функцыянавання / Ю. Ю. Атрошчанка // Фалькларыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі / пад нав. рэд. Р. М. Кавалёвай, В. В. Прыемка. – Мінск, 2011. – Вып. 8. – С. 180–183.

11. Атрошчанка, Ю. Ю. Аповеды і сказы: спроба гендарнага аналізу / Ю. Ю. Атрошчанка // Фалькларыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія Сувязі / пад нав. рэд. Р. М. Кавалёвай, В. В. Прыемка. – Мінск, 2013. – Вып. 10. – С. 145–148.

## Матэрыялы навуковых канферэнцый:

12. Вашкова, Ю. Ю. Метадалогія гендэрных даследаванняў у фалькларыстыцы / Ю. Ю. Вашкова // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання : зборнік навуковых прац удзельнікаў ІІІ Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Мінск, 29–30 красавіка 2009 г. / БДУКМ; рэд. кал.: М. А. Мажэйка [і інш.]. – Мінск, 2009. – С. 111–112.

13. Атрошчанка, Ю. Ю. Гендэрная праблематыка ў фальклорнай прозе ўсходніх славян / Ю. Ю. Атрошчанка // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай : матэрыялы IX Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 70-годдзю філалагічнага факультэта БДУ, Мінск, 15-17 кастрычніка 2009 г. : у 2 ч. / Белар. дзярж. ун-т; пад рэд. В. П. Рагойшы. – Мінск, 2010. – Ч. 1. – С. 287–291.

14. Атрощенко, Ю. Ю. Гендерная проблематика современной фольклористики / Ю. Ю. Атрощенко // Теория и практика гендерных

исследований в мировой науке : материалы международной научно-практической конференции, 5–6 мая 2010 г. / редкол.: А. С. Берберян [и др.]. – Пенза – Ереван – Прага, 2010. – С. 9–15.

15. Атрощенко, Ю. Ю. Гендерные стереотипы в восточнославянских народных сказках / Ю. Ю. Атрощенко // Филология XXI : материалы международной научной конференции, Караганда, 1 июня 2010 г. : в 2 ч. / под ред. Х. Х. Нурсеитова. – Караганда, 2010. – Ч.1. – С. 46–51.

16. Атрошчанка, Ю. Ю. Сацыяльны статус мужчыны і жанчыны ў беларускіх народных паданнях / Ю. Ю. Атрошчанка // История и культура на стыке эпох и цивилизаций: историко-культурное наследие как ресурс и результат развития общества : материалы международной научно-практической конференции, посвященной 250-летию М. К. Огинского, Минск, 25–26 сент. 2015 г. / редкол.: И. И. Калачева [и др.]. – Минск, 2015. – С. 57–60.

# РЭЗЮМЭ

**Атрошчанка Юлія Юр'еўна**

## Празаічныя жанры беларускага фальклору: гендарны аспект

**Ключавыя словы:** празаічныя жанры, гендар, гендарныя ўяўленні, гендарныя адносіны, статусы, ролі, гендарныя стэрэатыпы, мастацкі свет, тыповы персанаж, сям'я, сямейныя каштоўнасці.

**Мэта даследавання**: комплексная характарыстыка сістэмы гендарных уяўленняў, увасобленай у творах казкавай і няказкавай прозы беларускага фальклору.

**Метады даследавання:** у рабоце былі выкарыстаны параўнальна-гістарычны, структурна-функцыянальны, структурна-тыпалагічны, а таксама метад дэканструкцыі і кантэнт-аналізу, метады класіфікацыі і тыпалогіі з'яў традыцыйнай культуры.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна:** упершыню ў айчыннай фалькларыстыцы вырашаюцца пытанні ўвасаблення гендарных уяўленняў у празаічных жанрах беларускага фальклору; даследуецца сістэма гендарных уяўленняў, звязаных з пэўнымі вобразамі ў карціне свету казкавай прозы беларусаў; на матэрыяле беларускіх чарадзейных казак вырашаецца праблема гендарнай вызначанасці фальклорнага «аўтара», якая не знайшла дастатковай рэалізацыі ў працах фалькларыстаў; разглядаюцца трансфармацыі сацыяльных статусаў мужчыны і жанчыны ў паданнях і вусных апавяданнях; высвятляецца своеасаблівасць сістэмы народна-хрысціянскіх поглядаў на ролі і функцыі жанчыны і мужчыны ў грамадстве, зафіксаваных у легендарнай і містычнай прозе; раскрываецца змест і перспектывы гендарнага падыходу ў фалькларыстыцы.

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні:** матэрыялы і вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны пры напісанні калектыўных манаграфій, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, у працэсе выкладання спецкурсаў і спецсемінараў па фальклоры, этнаграфіі, культуралогіі, гендарнай тэорыі.

**Галіны выкарыстання:** фалькларыстыка, літаратуразнаўства, культуралогія, этнаграфія.

# РЕЗЮМЕ

**Атрощенко Юлия Юрьевна**

**Прозаические жанры белорусского фольклора: гендерный аспект**

**Ключевые слова:** прозаические жанры, гендер, гендерные представления, гендерные отношения, статусы, роли, гендерные стереотипы, художественный мир, типовой персонаж, семья, семейные ценности.

**Цель исследования:** комплексная характеристика системы гендерных представлений, воплощенных в произведениях сказочной и несказочной прозы белорусского фольклора.

**Методы исследования:** в работе были использованы сравнительно-исторический, структурно-функциональный, структурно-типологический, а также метод деконструкции и контент-анализа, методы классификации и типологии явлений традиционной культуры.

**Полученные результаты и их новизна**: впервые в отечественной фольклористике решаются вопросы воплощения гендерных представлений в прозаических жанрах белорусского фольклора; исследуется система гендерных представлений, связанных с определенными образами в картине мира сказочной прозы белорусов; на материале белорусских волшебных сказок решается проблема гендерной определенности фольклорного «автора», которая не нашла достаточной реализации в работах фольклористов; рассматриваются трансформации социальных статусов мужчины и женщины в представлениях и устных рассказах; выясняется своеобразие системы народно-христианских взглядов на роли и функции женщины и мужчины в обществе, зафиксированных в легендарной и мистической прозе; раскрывается содержание и перспективы гендерного подхода в фольклористике.

**Рекомендации по практическому использованию:** материалы и результаты исследования могут быть использованы при написании коллективных монографий, учебно-методических пособий, в процессе преподавания спецкурсов и спецсеминаров по фольклор, этнографии, культурологии, гендерной теории.

**Область применения:** фольклористика, литературоведение, культурология, этнография.

# SUMMARY


## Atroshchanka Julia Jurevna

## Prosaic genres of Belarusian folklore: a gender aspect

**Key words:** prosaic genres, gender, gender perspectives, gender relations, statuses, roles, gender stereotypes, the art world, type character, family, family values.

**Research objective**: complex characteristic of the system of gender representations in the works of fairy and non-fairy prose of Belarusian folklore.

**Methods:** the following methods were used in the research: the comparative and historical method, the structural and functional method, the structural and typological method, the method of deconstruction and content analysis, methods of classification and typology of traditional culture phenomena.

**The results and their novelty:** for the first time the issues of the embodiment of gender representations in the prosaic genres of Belarusian folklore are solved in the national folklore; the system of gender representations connected with certain images in the world picture of fairy prose of Belarusians is investigated; the problem of gender certainty of the folklore “author” on the material of Belarusian fairy tales is solved and it has not found sufficient realization in the works of folklorists; transformations of social statuses of men and women in representations and oral stories are considered; the peculiarity of the system of national Christian views on the roles and functions of women and men in society, that are fixed in the legendary and mystical prose, is being revealed; the content and perspectives of the gender slant in folklore are revealed.

**Practical use:** materials and research results can be used to write collective monographs, teaching aids, in the process of teaching special courses and special seminars on folklore, ethnography, cultural studies and gender theory.

**Sphere of use:** folklore studies, history and criticism of literature, culture studies, ethnography.